Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

Мікалай Волкаў

# Слуцк на старых планах

Мінск
«Беларусь»
2017

УДК [711.4+394](476.1-21Слуцк)
ББК 85.118(4Беи)
В67

Рэкамендавана да друку Вучоным Саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Праца выканана ў рамках планавай навуковай тэмы
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
«Картаграфічныя матэрыялы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі»

Навуковы рэдактар:
кандыдат гістарычных навук *Дзяніс Лісейчыкаў*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *Валянцін Голубеў*
доктар гістарычных навук, дацэнт *Юрый Бохан*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Волкаў, М. А.**
В67 Слуцк на старых планах / М. А. Волкаў ; навук. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. — Мінск : Беларусь, 2017. — 159 с. : іл.
ISBN 978-985-01-1227-9.

У кнізе з апорай на багаты выяўленчы матэрыял адлюстравана гісторыя Слуцка, аднаго з найбольш самабытных гарадоў Беларусі. Асновай для вывучэння шматграннай і яскравай мінуўшчыны Слуцка з'яўляюцца планы горада і яго частак XVII — пачатку XX ст. Для раскрыцця асаблівасцей архітэктуры паселішча ў кнізе таксама змешчаны малюнкі асобных будынкаў і архітэктурных комплексаў, а таксама фотаздымкі горада. Большасць планаў і малюнкаў былі выяўлены ў архівах Беларусі, Польшчы, Германіі, Расіі і Літвы і публікуюцца ўпершыню.

Прызначаецца для ўсіх, хто цікавіцца мінуўшчынай Слуцка, а таксама гісторыяй архітэктуры і горадабудаўніцтва Беларусі.

**УДК [711.4+394](476.1-21Слуцк)**
**ББК 85.118(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1227-9**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2017
© Афармленне. Выдавецтва «Беларусь», 2017

# Змест

Уводзіны ..... 5
1. Гісторыя Слуцка ..... 9
2. Старое места ..... 63
3. Новае места ..... 99
4. Трайчаны ..... 123
5. Востраў ..... 139
Заключэнне ..... 147
Спіс вуліц Слуцка ..... 149
Слоўнік тэрмінаў ..... 153
Спіс скарачэнняў ..... 154
Спіс малюнкаў ..... 155




# Уводзіны

Слуцк з’яўляецца адным з самых старых беларускіх гарадоў і мае своеасаблівую і вельмі адрозную ад іншых паселішчаў нашай краіны гісторыю. Гэта тлумачыцца адметнасцю шляху развіцця горада ў мінулым. З XV да канца XVIII ст. Слуцк з’яўляўся цэнтрам адной з найбуйнейшых зямельных латыфундый у Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай — Слуцкага княства. У розныя часы яго ўласнікамі былі вельмі багатыя роды Алелькавічаў і Радзівілаў. Эканамічная і палітычная магутнасць гаспадароў дазваляла ім адчуваць пэўную самастойнасць ад цэнтральнай улады. Таму насуперак канфесійнай палітыцы Рэчы Паспалітай, скіраванай найперш на падтрымку рымска-каталіцкай царквы, Слуцк пад пратэкцыяй князёў Алелькавічаў і Радзівілаў зрабіўся буйнейшым цэнтрам праваслаўя і пратэстантызму на беларуска-літоўскіх землях. Гэта абумовіла спецыфіку культурнага развіцця горада. Акрамя таго, уласнікі Слуцка прыкладалі значныя намаганні для яго эканамічнага развіцця, што спрыяла хуткаму росту паселішча. Таму ў XV—XVIII стст. Слуцк стаў адным з буйнейшых гарадоў ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Сіла і заможнасць горада адбілася ў актыўным фартыфікацыйным будаўніцтве ў згаданы перыяд. У выніку Слуцк ператварыўся ў наймагутнейшы горад-фартэцыю і пакінуў значны след у ваеннай і палітычнай гісторыі. Пасля ўваходжання ў склад Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. дзякуючы багатай гістарычнай і культурнай спадчыне Слуцк працягваў захоўваць сваю адметнасць.

У цяперашні час мала што нагадвае пра былы росквіт горада. Прычына гэтага найперш у тым, што ў самім Слуцку захавалася зусім няшмат помнікаў, якія б сведчылі аб яго старажытнай гісторыі. Яшчэ ў 1909 г. даследчык слуцкай мінуўшчыны Андрэй Снітка пісаў, што «*кожная царква ў Слуцку ўяўляе сабой цэлы музей даволі каштоўных прадметаў царкоўных старажытнасцей*»[1]. Але пераважна драўляная забудова горада моцна пацярпела ў час бурлівых падзей першай паловы — сярэдзіны XX ст. Многія драўляныя будынкі былі спалены, а мураваныя пашкоджаны і затым не аднаўляліся. Таму з сямі драўляных цэркваў і званіц, якія былі ўзяты пад ахову дзяржавы ў 1926 г., да цяперашняга часу захавалася толькі адна[2]. Акрамя таго, у другой палове XX ст. з прычыны непрадуманай горадабудаўнічай палітыкі былі амаль цалкам знішчаны рэшткі земляных умацаванняў калісьці слыннай фартэцыі.

*← Слуцк на карце Вялікага Княства Літоўскага. 1613 г.*

Нягледзячы на неспрыяльныя для захавання культурнага ландшафту абставіны, да нашага часу дайшоў цэлы комплекс сапраўды ўнікальных візуальных крыніц, якія ў літаральным сэнсе дазваляюць убачыць стары Слуцк. Гаворка ідзе пра планы горада і яго частак. Пры гэтым у параўнанні з многімі іншымі паселішчамі Беларусі Слуцку неверагодна пашанцавала, бо ў архівах і бібліятэках розных краін захавалася значная колькасць планаў горада сярэдзіны XVII — пачатку XX ст. Разам з тым у архівасховішчах захоўваецца шмат пісьмовых крыніц па гісторыі Слуцка. Аднак у адрозненне ад іх планы як іканаграфічныя крыніцы даступныя для ўспрымання і вывучэння не толькі спецыялістам-гісторыкам, але і шырокаму колу зацікаўленых людзей. Гэта робіць іх важнейшым сродкам для папулярызацыі гісторыі горада.

На сённяшні дзень планы Слуцка раскіданы па архівасховішчах розных краін. У час шматгадовых пошукаў удалося выявіць планы горада ў Беларусі, Польшчы, Расіі, Германіі і Літве. Найбольшая калекцыя планаў Слуцка і яго частак захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Сярод іх самы ранні план горада сярэдзіны XVII ст. аўтарства Януша Радзівіла. Выяўленыя ў НГАБ планы сканцэнтраваны ў фондах № 120 «Мінская губернская чарцёжная», № 146 «Мінская палата грамадзянскага суда», № 694 «Радзівілы, князі» і № 1477 «Тапаграфічныя карты і планы вёсак, сёлаў і маёнткаў Мінскай губерні». Вялікая калекцыя планаў Слуцка захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве. Сюды яны трапілі разам з часткай нясвіжскага архіва і захоўваюцца ў фондах № 354 «Архіў Радзівілаў» і № 402 «Картаграфія». Шмат планаў Слуцка захоўваецца ў архівах Расіі. Большасць з іх была створана ў выніку дзейнасці органаў расійскай адміністрацыі. Напрыклад, камплект планаў участкаў зямлі ў Слуцку, якія належалі ваеннаму ведамству, знаходзіцца ў Расійскім дзяржаўным архіве ваенна-марскога флота. Шэраг надзвычай цікавых планаў быў выяўлены ў нямецкіх архівах і бібліятэках (Берлін, Дрэздэн, Дармштадт). Нягледзячы на пэўныя поспехі, праца па выяўленні планаў Слуцка яшчэ далёкая ад завяршэння. Асабліва перспектыўнымі для далейшых даследаванняў, на нашу думку, з'яўляюцца архівасховішчы Расіі і Германіі.

Галоўнай мэтай гэтай кнігі з'яўляецца публікацыя і ўвядзенне ў шырокі ўжытак выяўленых на цяперашні час агульных планаў Слуцка і асобных частак горада. Для іх суправаджэння ў выданні змешчаны іншыя іканаграфічныя крыніцы: малюнкі, фотаздымкі і архітэктурныя праекты. Гэта, з аднаго боку, дапаможа лепей зразумець самі планы, а з другога — дазволіць больш выразна прадставіць мінулае горада[3]. Праца з планамі з прыцягненнем звестак з пісьмовых крыніц і напрацовак папярэдніх даследчыкаў дазваляе па-новаму зірнуць на мінулае Слуцка. Па-першае, мы маем магчымасць больш дакладна вывучыць працэс узнікнення і росту паселішча, фарміравання розных яго частак і горадабудаўнічай структуры ў цэлым. Па-другое, робяцца зразумелымі многія моманты яго гісторыі, якія цяжка патлумачыць на падставе адных толькі пісьмовых крыніц. Таму ў якасці суправаджэння да планаў была зроблена спроба напісаць гісторыю Слуцка з пункту гледжання яго развіцця як паселішча. Як нам падаецца, апора на планы дазваляе стварыць цэласную карціну мінулага горада, а таксама падкрэсліць яго спецыфіку. Акрамя таго, асаблівая ўвага звернута на развіццё асобных частак горада і гісторыю найбольш важных архітэктурных помнікаў. З аднаго боку, на падставе планаў можна вывучаць гісторыю і архітэктуру асобных будынкаў, а з другога — іх адлюстраванне на планах дае магчымасць для атрыбуцыі саміх планаў.

Падрыхтоўка гэтай кнігі стала магчымай дзякуючы падтрымцы і дапамозе многіх людзей і арганізацый. Выказваю самую шчырую падзяку дырэктару Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь **Віктару Курашу**, дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі **Дзмітрыю Яцэвічу**, намесніку дырэктара **Дзянісу Лісейчыкаву**, які асабіста дапамагаў у пошуку і зборы матэрыялаў, а таксама ў падрыхтоўцы рукапісу кнігі, і загадчыку аддзела публікацыі дакументаў **Дзмітрыю Матвейчыку**. Працы над выданнем значна паспрыяла дапамога шэрагу архіваў і бібліятэк, якія прадставілі копіі планаў і выяў горада і яго помнікаў са сваіх калекцый. Выказваю падзяку Беларускаму дзяржаўнаму архіву кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск) і асабіста яго дырэктару **Віктару Баландзіну** і загадчыку аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій **Генадзю Дубатоўку**, Беларускаму дзяржаўнаму архіву навукова-тэхнічнай дакументацыі (г. Мінск) і асабіста яго дырэктару **Аляксандру Запартыку**, Нацыянальнаму гістарычнаму музею Рэспублікі Беларусь (г. Мінск) і асабіста яго дырэктару **Алегу Рыжкову** і загадчыку аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц **Надзеі Саўчанка**, Галоўнаму архіву старажытных актаў (г. Варшава) і асабіста яго дырэктару **Губерту Вайсу**, Інстытуту мастацтваў Польскай акадэміі навук (г. Варшава) і асабіста яго дырэктару **Эльжбэце Віткоўскай-Зарэмба** і супрацоўнікам **Пятру Ласеку** і **Пятру Ямскаму**, Расійскаму дзяржаўнаму архіву ваенна-марскога флоту (г. Санкт-Пецярбург) і асабіста яго дырэктару **Валянціну Смірнову**, бібліятэцы Расійскай акадэміі навук (г. Санкт-Пецярбург) і асабіста яго дырэктару **Валерыю Ляонаву**, Літоўскаму дзяржаўнаму гістарычнаму архіву (г. Вільня) і асабіста яго дырэктару **Віргініі Чыюнскене** і намесніку дырэктара **Альфонсасу Тамулінасу**. Значную дапамогу ў выяўленні і атрыманні копій асобных планаў аказалі **Ігар Госцеў**, **Мікалай Нікалаеў** і **Герман Брэгер**. У апрацоўцы крыніц па гісторыі Слуцка карыснымі былі кансультацыі **Настассі Скеп'ян** і **Сяргея Палехава**, пры напісанні і карэктуры рукапісу кнігі — парады **Вольгі Волкавай**. Урэшце вялікай удачай для аўтара была магчымасць кансультавацца з вядомым слуцкім краязнаўцам **Ігарам Ціткоўскім**.

Найвялікшую ўдзячнасць хачу выказаць сваім дзядулі і бабулі **Мікалаю** і **Яўгеніі Шагунам**. Пад іх апекай у вёсцы Зажэвічы колішняга Слуцкага княства нарадзілася глыбокая замілаванасць зямлёй продкаў і любоў да яе, што ў далейшым штурхала мяне да вывучэння гісторыі Случчыны. Разам з тым вялікім прыкладам для мяне ў жыцці і ў працы з'яўляюцца дзядуля і бабуля **Міхаіл** і **Кацярына Волкавы** з Брагіншчыны. Ім усім я хачу прысвяціць гэтую кнігу.

[1] Снитко А. Из слуцкой старины // Минская старина. 1911. Вып. 2. С. 155.

[2] Ціткоўскі І.А. Помнікі архітэктуры Слуцка. Слуцк : Смэлтак, 1997. С. 3.

[3] Паколькі публікацыя планаў з'яўляецца асноўнай мэтай гэтага выдання, спасылкі на архівы, дзе захоўваюцца планы, змешчаны ў подпісах да іх. Спасылкі на выявы іншага характару (фотаздымкі, малюнкі) змешчаны ў агульным спісе малюнкаў у дадатку.

# Спіс скарачэнняў

АСТСТМ — Архіў Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра
БАН — Библиотека Российской академии наук
БДАКФФД — Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў
БДАНТД — Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі
НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
НГМРБ — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь
ООРК — Основная опись рукописных карт
РГАВМФ — Российский государственный архив военно-морского флота
РНБ — Российская национальная библиотека
AGAD — Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie
AR — Archiwum Radziwiłłów
BN — Biblioteka Narodowa w Warszawie
BUW — Biblioteka Uniwersytecka w Warszawie
HSAD — Hessisches Staatsarchiv Darmstadt
IS PAN — Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk
LMAVB — Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka
LVIA — Lietuvos valstybės istorijos archyvas
SBB—PK — Staatsbibliothek zu Berlin — Preußischer Kulturbesitz
SLUB — Sächsische Landesbibliothek — Staats- und Universitätsbibliothek Dresden
TOnZP — Towarzystwo Opieki nad Zabytkami Przeszłości
VUB — Vilniaus universiteto biblioteka



# Спіс малюнкаў


**Уводзіны**
Слуцк на карце Вялікага Княства Літоўскага. 1613 г. http://vkraina.com/en/maps#1613_1

**1. Гісторыя Слуцка**
1.1. Фрагмент плана Слуцка і ваколіц. В. Пашкевіч, 1840 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 22.
1.2. Старонка Слуцкага Евангелля, перапісанага Юрыем III. 1582 г. Святое Евангелие. Слуцк, 1582. Факсимильное изд. Минск : Белорусская Православная Церковь : Национальная библиотека Беларуси, 2009.
1.3. Януш VI Радзівіл. Я. Хейдэн, 1609 г. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Januš_Radzivił._Януш_Радзівіл_(J._Heyden,_1609)_.jpg
1.4. Аздабленне старонкі інвентара Слуцка. 1642 г. НГАБ. Ф. 146. Воп. 3. Спр. 24. Арк. 252.
1.5. Януш XI Радзівіл. 1663 г. https://commons.wikimedia.org/wiki/File: Januš_Radzivił._Януш_Радзівіл_(1663).jpg
1.6. План Слуцка. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 40.
1.7. Брама Спаскага манастыра. Бакавы фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 36.
1.8. Брама Спаскага манастыра. Галоўны фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 37.
1.9. Брама Спаскага манастыра. Бакавы фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 36.
1.10. Брама Спаскага манастыра. Галоўны фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 38.
1.11. Брама Спаскага манастыра. Купал і крыж. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 37 адв.
1.12. Брама Спаскага манастыра. Задні фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 37 адв.
1.13. Брама Спаскага манастыра. План другога паверха і задні фасад. Я. Радзівіл, сяр. XVII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 287. Арк. 37 адв.
1.14. Багуслаў Радзівіл. Д. Шульц, 1654 г. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Bahusłaŭ_Radzivił._Багуслаў_Радзівіл_(D._Schultz,_1654).jpg
1.15. Грамата Багуслава Радзівіла Слуцку. 1659 г. AGAD. AR. Dz. VII. Nr. 678. S. 61.
1.16. План часткі слуцкай цытадэлі. К. Клакоцкі, 1662 г. AGAD. AR. Dz. VII. Nr. 678. S. 41.
1.17. План часткі Старога места. 1696 г. AGAD. AR. Dz. VIII. Nr. 517. S. 3.
1.18. План Слуцка. Я. Фойгт, 1704 г. БАН. ООРК. № 791.
1.19. План Слуцка. А. Гафо, 1731 г. HSAD. P 2. 67/101.
1.20. План Слуцка. Я. Фюрстэнхоф, перш. пал. XVIII ст. SLUB. Handschriftensammlung. Mscr. Dresd. R. 30. M, II.
1.21. План Слуцка. Я. Фюрстэнхоф, перш. пал. XVIII ст. SBB-PK. Kart. XS49911/12.
1.22. План Слуцка. Я. Фюрстэнхоф, перш. пал. XVIII ст. SBB-PK. Kart. XS49911/10.

1.23. Выява фартэцыі. Сяр. XVIII ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 7. Спр. 934. Арк. 1.
1.24. Геранім Фларыян Радзівіл. Я. Весэль, сяр. XVIII ст. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Wessel_Hieronim_Radziwiłł.jpg
1.25. Караль Станіслаў Радзівіл. Тр. чв. XVIII ст. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Karal_Stanisłaŭ_Radzivił_Panie_Kachanku._Караль_Станіслаў_Радзівіл_Пане_Каханку_(1767).jpg
1.26. План Слуцка і ваколіц. Сяр. 1760-х гг. Замкі, палацы і сядзібы ў кантэксце еўрапейскай культуры. Зборнік навуковых артыкулаў. Мінск : Медысонт, 2013. С. 242.
1.27. План Слуцкага княства. 1835 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 60.
1.28. План Слуцкага княства. М. Клячкоўскі, перш. пал. XIX ст. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 61.
1.29. План Слуцка. 1792 г. РНБ. Ф. 342. Д. 1433.
1.30. План Слуцка. С. Бяспалаў, 1799—1800 гг. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2878.
1.31. План Слуцка. 1800—1804 гг. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3232.
1.32. План Слуцка. В. Смірноў, 1800—1804 гг. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3233.
1.33. Герб Слуцка на плане горада. В. Смірноў, 1800—1804 гг. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп 6. Д. 3233.
1.34. План Слуцка з адлюстраваннем праекта перапланіроўкі спаленай часткі горада. Я. Саковіч, 1811 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2876.
1.35. План Слуцка з адлюстраваннем праекта перапланіроўкі спаленай часткі горада. А. Пароўскі, 1811 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 21.
1.36. План Слуцка з адлюстраваннем праекта перапланіроўкі спаленай часткі горада. Маркевіч, 1811 г. НГАБ. Ф. 299. Воп. 5. Спр. 86. Арк. 5.
1.37. План Слуцка з адлюстраваннем праекта перапланіроўкі правабярэжнай часткі горада. 1811 г. (?) Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в. Мінск : Навука і тэхніка, 1991. С. 309.
1.38. План Слуцка. 1812 г. SBB-PK. Kart. XS49911/15.
1.39. План Слуцка і ваколіц. В. Пашкевіч, 1840 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 22.
1.40. Праект перапланіроўкі Слуцка. Сяр. XIX ст. IS PAN. TOnZP. Nr. 32059.
1.41. Праект гаўптвахты ў Слуцку. Перш. пал. XIX ст. НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Спр. 4021. Арк. 18.
1.42. План Слуцка. 1917 г. SBB-PK. Kart. XS49911/12.
1.43. Фрагмент генеральнага плана Слуцка. Г. Парсадонаў, 1947 г. БДАНТД. Ф. 3. Воп. 4. Спр. 596.
1.44. Фрагмент генеральнага плана Слуцка. 1971 г. БДАНТД. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 212.

**2. Старое места**
2.1. Фрагмент плана Слуцка. Я. Фюрстэнхоф, перш. пал. XVIII ст. SBB-PK. Kart. XS49911/12.
2.2. Стары замак на плане Слуцка Я. Фойгта 1704 г. БАН. ООРК. № 791.
2.3. Стары замак на плане Слуцка Я. Фюрстэнхофа перш. пал. XVIII ст. SBB-PK. Kart. XS49911/10.
2.4. Святыя Пётр і Павел. Абраз з Траецкага манастыра. XVII—XVIII стст. Слуцк. Путешествие во времени. Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. С. 33.
2.5. План Верхняга замка. Др. пал. XVIII ст. AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 133. Pl. 1. S. 298.
2.6. Стары замак на плане Слуцка 1792 г. РНБ. Ф. 342. Д. 1433.
2.7. План Ніжняга замка. А. Макрацкі, 1821 г. AGAD. AR. Dz. VIII. Nr. 515. S. 29.
2.8. Фрагмент плана царкоўных зямель у Слуцку. Ячыноўскі, 1852 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1395.
2.9. План зямель саборнай царквы. Д. Глудзін, 1902 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1374.
2.10. Мікалаеўскі сабор. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22993.
2.11. Від з моста. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22992.
2.12. Від з моста на Калоніі. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22986.
2.13. План пляцаў, перададзеных дому дабрачыннасці. В. Пашкевіч, 1826 г. НГАБ. Ф. 146. Воп. 3. Спр. 21. Арк. 2805 адв 2806.
2.14. Фарны касцёл. Ю. Гесэ, 1855 г. Gloger Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce. T. 2. Warszawa : nakl. Wł. Łazarskiego, 1909. S. 147.
3.15. Плябанія. Пач. XX ст. IS PAN. Неінвентарызаваны фотаздымак.
3.16. Капліца на месцы фарнага касцёла. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22985.
2.17. Капліца. Пач. XX ст. Nasze kościoły. S. 3.
2.18. Капліца. Пач. XX ст. Nasze kościoły. 1914. T. 2. Djecezja mińska. Z. 18. Dekanat słucki. S. 3.
2.19. Фрагмент плана зямель Уваскрэсенскай царквы. М. Ланінскі, 1902 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1372.
2.20. Пячатка Уваскрэсенскай царквы. Кан. XIX — пач. XX ст. НГМРБ. КП 40851/16 П 732.
2.21. План размяшчэння скасаванага бернардзінскага кляштара. 1844 г. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3234.
2.22. Скасаваны бернардзінскі кляштар. Галоўны фасад і план першага паверха. 1844 г. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3239.
2.23. Скасаваны бернардзінскі кляштар. План падвалаў. 1844 г. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3238.
2.24. План размяшчэння будынкаў ваеннага ведамства. 1861 г. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3236.
2.25. План размяшчэння будынкаў ваеннага ведамства. 1864 г. РГАВМФ. Ф. 3Л. Оп. 26. Д. 3237.
2.26. Бернардзінскі касцёл. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22990.
2.27. Алтар бернардзінскага касцёла. Пач. XX ст. IS PAN. Неінвентарызаваны фотаздымак.
2.28. Раждзественская царква. Фота Ю. Смалінскага, 1904 г. Kałamajska-Saeed M. Portrety i zabytki. S. 5.
2.29. Раждзественская царква. Пач. XX ст. НГМРБ. НД 4221.
2.30. Фрагмент іканастаса Раждзественскай царквы. Фота Ю. Смалінскага, 1904 г. Kałamajska-Saeed M. Portrety i zabytki książąt Olelkowiczów w Słucku: inwentaryzacja Józefa Smolińskiego z 1904 r. Warszawa, 1996. S. 6.
2.31. Званіца Раждзественскай царквы. Пач. XX ст. НГМРБ. НД 4231.
2.32. План часткі Слуцка, знішчанай пажарам 1811 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 12.
2.33. План часткі Слуцка, знішчанай пажарам 1811 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 7.
2.34. Фрагмент плана часткі Слуцка і навакольных зямель. Перш. пал. XIX ст. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 4.
2.35. План рынку. 1837 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 5.
2.36. План часткі Слуцка. В. Фядзюшын, 1887 г. НГАБ. Ф. 22. Воп. 2. Спр. 9.
2.37. План рынкавых плошчаў. К. Даўгяла, 1895 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2819.
2.38. Праект гандлёвых лавак на рынкавай плошчы. К. Даўгяла, 1895 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2819.
2.39. Рынкавая плошча. Пач. XX ст. Ціткоўскі І.А. Слуцк. Гісторыя горада ў помніках архітэктуры. Мінск : Смэлтак, 2015. С. 147.
2.40. Кірмаш у Слуцку. Пач. XX ст. НГМРБ. КП 11353.
2.41. Праект мураваных лавак на Шасэйнай вуліцы. 1869 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2822.

2.42. Праект сінагогі. 1870 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2823.
2.43. План зямель былога Іллінскага манастыра. Д. Глудзін, 1902 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1374.
2.44. План зямель былога Спаскага манастыра. Д. Глудзін, 1902 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1374.
2.45. Від з моста. Пач. XX ст. НГМРБ. КП 11350.
2.46. Халодная сінагога. Я. Кругер, 1921 г. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Якаў_Кругер._Халодная_сінагога_ў_Слуцку.JPG

**3. Новае места**
3.1. Фрагмент плана Слуцка 1792 г. РНБ. Ф. 342. Д. 1433.
3.2. Чатырохбастыённая фартэцыя. Ю. Нарановіч-Наронскі, 1659 г. BUW. Rps. Nr. 1954. S. 50.
3.3. Цытадэль на плане Слуцка Я. Фойгта 1704 г. БАН. ООРК. № 791.
3.4. Цытадэль на плане Слуцка Я. Фюрстэнхофа перш. пал. XVIII ст. SLUB. Handschriftensammlung. Mscr. Dresd. R. 30. M, II.
3.5. Цытадэль на плане Слуцка 1792 г. РНБ. Ф. 342. Д. 1433.
3.6. Профіль валоў цытадэлі і гарадскіх умацаванняў. Др. пал. XVII ст. AGAD. AR. Dz. XXIII. T. 133. Pl. 1. S. 295.
3.7. План лазарэта на тэрыторыі цытадэлі. 1849 г. НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 25. Арк. 412.
3.8. План лазарэта на тэрыторыі цытадэлі. 1849 г. НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 25. Арк. 413.
3.9. План тэрыторыі цытадэлі. 1878 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 5.
3.10. План зямель бернардзінскага кляштара. К. Касоўскі, 1809 г. НГАБ. Ф. 146. Воп. 3. Спр. 21. Арк. 2833.
3.11. Фрагмент плана зямель прадмесця Калонія, фальваркаў Ячава і Плябанцы. К. Баравік, 1852 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1394.
3.12. План прадмесця Калонія. К. Баравік, 1853 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1397.
3.13. Від з моста каля гімназіі. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 11356.
3.14. Праект франтона кальвінісцкага збору. М. Прусак, перш. пал. XVII ст. LVIA. F. 1280. A. 1. B. 2053. P. 1.
3.15. Праект кальвінісцкага збору. М. Прусак, перш. пал. XVII ст. LVIA. F. 1280. Ap. 1. B. 2053. P. 1v.
3.16. План зямель кальвінісцкага збору. 1865 г. Глебов И.А. Историческая записка о Слуцкой гимназии 1617—1630—1901 гг. Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1903.
3.17. Кальвінісцкі збор і гімназія. Пач. XX ст. БДАКФФД. № 0-013716.
3.18. План зямель гімназіі. 1901 г. Глебов И.А. Историческая записка.
3.19. Кальвінісцкі збор і гімназія. Пач. XX ст. БДАКФФД. № 0-013716.
3.20. План будынкаў скасаванага езуіцкага калегіума. Д. Пятроўскі, Г. Мілеўскі, 1804 г. LVIA. F. 567. Ap. 27. B. 9.
3.21. Праект касцёла езуітаў. Папярочны разрэз. Пач. XVIII ст. Paszenda J. Budowle jezuickie w Polsce XVIXVIII w. T. 1. Kraków : Wydawn. WAM, 1999. S. 363.
3.22. Праект касцёла езуітаў. План. пач. XVIII ст. Paszenda J. Budowle jezuickie. S. 364.
3.23. Праект узвядзення будынкаў гімназіі на зямлі спаленага езуіцкага калегіума. 1810 г. AGAD. AR. Dz. VIII. Nr. 543. S. 240.
3.24. План часткі Новага места. 1822 г. НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 7527. Арк. 957.
3.25. План зямель Юр'еўскай царквы. М. Ланінскі, 1902 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1373.
3.26. Фрагмент плана паштовай дарогі праз Слуцк. Нарзімскі, 1836 г. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 3184.
3.27. Сімяонаўская царква ў Баслаўцах. Дабрамыслаў, 1869 г. НГАБ. Ф. 43. Воп. 5. Спр. 3. Арк. 11.
3.28. Фрагмент плана прадмесця Выгода. 1839 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 10.

**4. Трайчаны**
4.1. Фрагмент плана прадмесця Трайчаны. 1839 г. НГАБ. Ф. 146. Воп. 3. Спр. 32. Арк. 88.
4.2. Фрагмент плана зямель Траецкага манастыра. К. Баравік, 1852 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1383.
4.3. Фрагмент плана прадмесця Трайчаны. К. Баравік, 1852 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1383.
4.4. План зямель часткі прадмесця Трайчаны. К. Баравік, 1856 г. НГАБ. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 1384.
4.5. Траецкая царква. Н. Орда, тр. чв. XIX ст. https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Słucak,_Trajčany._Слуцак,_Трайчаны_(N._Orda,_1864).jpg
4.6. Траецкі манастыр. Фота Ю. Смалінскага, 1904 г. Kałamajska-Saeed M. Portrety i zabytki. S. 4.
4.7. Траецкі манастыр. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. BN. Poczt. 11128.
4.8. Духоўнае вучылішча. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. Слуцк. Путешествие во времени. С. 52.
4.9. Брама Траецкага манастыра. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22989.
4.10. Іканастас Стэфанаўскай царквы. Пач. XX ст. НГМРБ. НД 4222.
4.11. План часткі прадмесця Трайчаны. Перш. чв. XIX ст. AGAD. F. 402. T. 441. Nr. 20.
4.12. План размяшчэння прысутных месцаў з адлюстраваннем праекта ўзвядзення новага будынка для іх. Сяр. XIX ст. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2818. Арк. 5.
4.13. Прысутныя месцы. Галоўны фасад і план першага і другога паверхаў. 1845 г. НГАБ. Ф. 299. Воп. 5. Спр. 161.
4.14. Праект пабудовы новых прысутных месцаў. Галоўны фасад. Сяр. XIX ст. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2817.
4.15. Праект пабудовы новых прысутных месцаў. План. Сяр. XIX ст. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2818. Арк. 12.
4.16. Камерцыйнае вучылішча. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22994.
4.17. Камерцыйнае вучылішча. Пач. XX ст. НГМРБ. КП 11346.
4.18. Аўтамабільны рух. Фота С. Юхніна, пач. XX ст. НГМРБ. КП 22981.
4.19. Фрагмент плана прадмесця Сёлка. 1839 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 8.
4.20. Фрагмент плана прадмесця Сёлка. 1839 г. НГАБ. Ф. 146. Воп. 3. Спр. 32. Арк. 83.
4.21. План часткі прадмесця Сёлка. І. Мадзалеўскі, др. пал. XIX ст. НГАБ. Ф. 1477. Воп. 1. Спр. 2821.

**5. Востраў**
5.1. Фрагмент плана прадмесця Востраў. В. Пашкевіч, сяр. XIX ст. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 3.
5.2. План прадмесця Востраў. 1838 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 20.
5.3. Фрагмент плана прадмесця Востраў. В. Пашкевіч, сяр. XIX ст. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 3.
5.4. План зямель прадмесця Востраў. 1838 г. AGAD. F. 402. T. 452. Nr. 2.
5.5. План зямель слуцкага мешчаніна Давіда Беркавіча Турава на прадмесці Востраў. І. Мадзалеўскі, 1880 г. НГАБ. Ф. 147. Воп. 3. Спр. 25738.
5.6. Міхайлаўская царква. Пач. XX ст. БДАКФФД. № 0-120626.
5.7. Варварынская царква. Пач. XX ст. БДАКФФД. № 0-120627.
5.8. Унутранае аздабленне алтарнай часткі каталіцкай капліцы на могілках. Пач. XX ст. IS PAN. TOnZP. Nr. 4975.
5.9. Унутранае аздабленне алтарнай часткі каталіцкай капліцы на могілках. Пач. XX ст. IS PAN. TOnZP. Nr. 4977.